# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 4(78) 2013**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**

***Галоўны рэдактар***
**П.Д. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
В.В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л.М. Давыдзенка
А.В. Данільчанка
А.П. Жытко
М.М. Забаўскі
Г.У. Карзенка
І.В. Катляроў
П.В. Кікель
Г.А. Космач
А.М. Люты
У.А. Мельнік
А.І. Смолік
А.С. Цернавы
В.С. Цітоў

## Змест

### *Гісторыя*

*Лютая А.Э.* Социальный состав городского населения Беларуси (XIX – начало XX в.) ........ 3

*Атрушкевіч М.М.* Асаблівасці ажыццяўлення гарадской рэформы 1870 г. на тэрыторыі Беларусі ........ 8

*Талмачова С.А.* Увядзенне закона аб земскіх начальніках у Беларусі ........ 11

*Сямёнава С.А.* Роля купецтва ў развіцці прамысловасці Беларусі перыяду позняга феадалізму ........ 15

*Сувалаў А.М.* Развіццё крыніцазнаўчай базы даследаванняў этнагенезу беларусаў у канцы XIX – пачатку XX ст. ........ 18

*Тукайла Н.К.* Беларуская савецкая гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. ........ 22

*Завальнюк У.М.* Адлюстраванне праблемы посту ў расійскай гістарыяграфіі другой паловы XIX ст. ........ 26

*Веремеев С.Ф.* История протестантских общин Беларуси (1917–1941 гг.) в отечественной историографии ........ 30

*Кенійка А.У.* Палітыка царскіх улад у сферы кіравання транспартнымі камунікацыямі на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) ........ 36

*Канапацкая З.І.* Адукацыя татараў у Беларусі ў 20–30-х гг. XX ст. ........ 40

*Ворон В.П.* Политика российского самодержавия в сфере высшего аграрного образования на территории Привисленского края во второй половине XIX – начале XX в. ........ 44

*Крывуць В.І.* Праўрадавыя студэнцкія саюзы Віленскага ўніверсітэта, іх ідэйная эвалюцыя ў міжваенны перыяд ........ 47

*Ковяко И.И.* Англо-западногерманское партнерство в рамках НАТО (1980-е гг.) ........ 51

*Пискун В.Э.* Основные аспекты взаимоотношений между ПНР и ГДР в 1971–1990 гг. в польской историографии ........ 56

### *Філасофія*

*Бущик В.В.* Социокультурные детерминанты формирования и развития личности в трансформирующемся обществе ........ 61

*Кузнецов А.В.*, *Кузнецов В.В.* Концепция образования в свете эколого-футурологической парадигмы социально-гуманитарного знания ........ 65

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

становіцца мова. На аснове мовы складаюцца этнічныя карты беларускага этнасу і праводзяцца статыстычныя падлікі. У канцы XIX і пачатку XX ст. да мовы як этнавызначальнага крытэрыю дадаюцца агульнасць гістарычнага мінулага, фальклорна-этнаграфічныя асаблівасці, самасвядомасць. Аднак і на пачатак XX ст. беларусы заставаліся малавядомымі ў гістарычнай навуцы, паколькі большасць атрыманых на той час даных не былі ўведзены ў шырокі навуковы ўжытак.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Погодин, А.Л.* Следы корней-основ в славянских языках / А.Л. Погодин. – Варшава: Тип. Варшавск. учеб. окр., 1903. – [2], VIII, 312 с.
2. *Колосов, М.* Старославянская грамматика / М. Колосов. – 12-е изд. – Варшава: Тип. М. Земкевича и В. Ноаковского, 1883. – 67, XXVIII с.
3. *Погодин, А.Л.* Краткий очерк истории славян / А.Л. Погодин. – М.: Г.А. Леман, 1915. – 126 с.
4. *Ефименко, А.Я.* История Украины и ее народа / А.Я. Ефименко. – СПб.: Тип. т-ва «Общественная польза», 1907. – 178 с.
5. *Лелевель, И.* Краткие очерки истории польского народа / И. Лелевель; пер. Я. Ивановского. – СПб.: Тип. Безобразова и К, 1862. – [2], IV, 228, IV с.
6. *Багушэвіч, Ф.* Творы / Ф. Багушэвіч. – Мінск: Беларусь, 1967. – 228 с.
7. *Крип'якевич, І.П.* Білорусі / І.П. Крип'якевич. – у Львові: З друк. Наукового Товариства ім. Шевченка під зарядом К. Беднарського, 1909. – 16 с.
8. *Антоневич, Н.И.* История Белой Руси и белороссы / Н.И. Антоневич. – Львов: Ставропигийская тип. под упр. М. Рефця, 1908. – 108 с.
9. *Аппель, К.Ю.* О белорусском наречии / К.Ю. Аппель // Русский филологический вестник. – Т.III. – 1880. – № 1–2. – С. 197–224.
10. *Пыпин, А.Н.* История славянских литератур. В 2 т. Т. 1 / А.Н. Пыпин, В.Д. Спасович. – 2-е изд. – СПб.: Тип. М.М. Стасюлевича, 1879. – [XII], 358 с.
11. *Косич, М.Н.* Литвины-белорусы Черниговской губернии, их песни и быт / М.Н. Косич // Живая старина. – 1901. – Вып. II. – С. 221–260; *Косич, М.Н.* Литвины-белорусы Черниговской губернии, их песни и быт / М.Н. Косич // Живая старина. – 1901. – Вып. III–IV. – Отд. II. – С. 1–88.
12. *Довнар-Запольский, М.В.* Исследования и статьи / М.В. Довнар-Запольский. – Киев: А.П. Сапунов, 1909. – Т. I : Этнография и социология. Обычное право. Статистика. Белорусская письменность. – 486 с.
13. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.
14. *Розенфельд, А.А.* Белорусские народные песни / А.А. Розенфельд. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1904. – [2], 92 с.
15. *Малевич, С.* Белорусские народные песни / С. Малевич. – СПб.: Тип. Акад. наук, 1907. – [4], 194 с.
16. *Сапунов, А.* Белоруссия и белорусы / А. Сапунов. – Витебск, 1910. – 21 с.
17. *Богданович, А.Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А.Е. Богданович. – Гродно: Губ. тип., 1895. – 186 с.
18. *Вольтер, Э.А.* Статистика племенного состава народонаселения Северо-Западного края / Э.А. Вольтер. – М.: Тип. Рассвет, 1890. – 7 с.
19. *Будилович, А.С.* Статистические таблицы распределения славян: а) по государствам и народностям, б) по вероисповеданиям, азбукам и литературным языкам (наречиям) с объяснительною запискою А.С. Будиловича: Прил. к «Этнографической карте славянских народностей» М.Ф. Мирковича, изд. Петербург. отд. Славян. Благотвор. ком. / А.С. Будилович. – СПб.: Тип. и хромолитогр. А. Траншеля, 1875. – 23 с.: табл.
20. *Эркерт, Р.Ф.* Этнографический атлас западнорусских губерний и соседних областей / Р.Ф. Эркерт. – СПб.: [б.и.], 1863. – 1 атлас, ([2], 6 л).
21. *Риттих, А.* Атлас народонаселения западнорусского края по вероисповеданиям / А. Риттих. – СПб.: Тип. В. Веллинга, 1864. – [3] л., [6] сдв. л. табл., [8] сдв. л.
22. *Эркерт, Р.Ф.* Взгляд на историю и этнографию западных губерний России / Р.Ф. Эркерт. – СПб.: Тип. Дома призрения малолетних бедных, 1864. – [2], 72 с.
23. *Бобровский, П.* Можно ли одно вероисповедание принять в основание племенного разграничения славян Западной России? / П. Бобровский // Русский инвалид. – 1864. – № 75, 80.
24. *Коялович, М.О.* О расселении племен Западного края России / М.О. Коялович. – М.: Тип. Бахметева, 1863. – 36 с.
25. *Коялович, М.О.* Чтения по истории Западной России / М.О. Коялович. – СПб.: Тип. А.С. Суворина, 1884. – XII, 349 с.: 1 л. карт.
26. *Карский, Е.Ф.* К вопросу об этнографической карте белорусского племени // Известия отделения русского языка и словесности АН. – 1902. – Т. VII. – Кн. 3. – С. 219–234.
27. *Карский, Е.Ф.* Этнографическая карта белорусского племени / Е.Ф. Карский. – СПб.: Тип. Рос. Акад. наук, 1917. – 32 с.
28. *Дурново, Н.Н.* Труды Московской диалектологической комиссии. – Вып. 5: Опыт диалектологической карты русского языка в Европе (с приложением очерка русской диалектологии) // Сост. члены комиссии: Н.Н. Дурново, Н.Н. Соколов, Д.Н. Ушаков ; под ред. Д.Н. Ушакова. – М.: Синод. тип., 1915. – VI, 132 с.
29. *Багдановіч, М.А.* Беларускае адраджэнне: Літаратурныя артыкулы / М.А. Багдановіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 32 с.
30. *Дорошенко, Д.* Білоруси і їх національне відродження / Д. Дорошенко. – Київ: Видавництво «Український учитель», 1908. – 33 с.
31. *Шелепин, И.В.* Краткий очерк истории Западной России, Литвы и Польши / И.В. Шелепин. – 2-е изд. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1901. – 54 с.



*Summury*

*This article is dedicated to the problem of the research of Belarusian nation in the science of the end of the 19th – the beginning of the 20th century. Comprehensive study of Belarusians by different scientists – philologists, ethnographers, folklorists, historians, – made it possible to overcome the views, existed earlier in which Belarusians were considered to be a part of Russian or Polish nation and to formulate the first scientific conception of Belarusian ethnogenesis.*


Паступіў у радакцыю 26.04.2013 г.

*УДК 930(47+57):[94(476):63«16/18»]*

***Н.К. Тукайла,***
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АГРАРНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

Аграрная гісторыя Беларусі пазначанага часу даследавалася даволі нераўнамерна. Вывучэнне аграрных адносін перыяду крызісу феадальна-прыгонніцкіх і зараджэння буржуазных адносін засталіся па-за колам зроку гісторыкаў і патрабуюць аб'ектыўнай ацэнкі.

Рэпазіторый БДПУ

У рамках савецкага часу можна вылучыць некалькі этапаў вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі.

Так, першы этап прыпадае на 20-я – пачатак 50-х гг. ХХ ст. – час, калі навукоўцамі былі вызначаны напрамкі для вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі. У 20–30-я гг. ХХ ст. адзначаецца павышаная цікавасць айчынных гісторыкаў да аграрнай гісторыі, што тлумачыцца, на наш погляд, пераходным этапам у гістарыяграфіі: утварэнне савецкай дзяржавы, актыўныя даследаванні нацыянальнай гісторыі, зварот да сацыяльна-эканамічных пытанняў.

Адметнымі ў пачатку 20-х гг. ХХ ст. былі працы У.І. Пічэты: «История народного хозяйства России XIX–XX вв.» (Москва, 1922 г.) і «История крестьянских волнений в России» (Минск, 1923 г.). Аўтар дасканала аналізуе вызначаныя праблемы і прыводзіць прыклады аграрных адносін з далучаных тэрыторый. У.І. Пічэта вызначыў працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця Расіі XIX ст. з улікам пашырэння зямель: пачатак развіцця прамысловага капіталу і разлажэнне прыгоннай гаспадаркі, развіццё ўнутранага і знешняга гандлю. Усе працэсы, на думку аўтара, былі ўзаемазвязаны, аднак гісторык іх не атаясамліваў. Варта адзначыць, што адной з прычын відавочных змен сацыяльна-эканамічнага развіцця аўтар называе далучэнне новых тэрыторый (Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны). Навуковец даследуе сельскагаспадарчую палітыку і прыходзіць да высновы аб значнай розніцы ў стане і структуры сельскай гаспадаркі заходніх і ўсходніх губерняў Расіі. У.І. Пічэта аналізуе развіццё феадальнай гаспадаркі, якое выяўляла неабходныя радыкальныя змены сацыяльных адносін. Ён адзначае, што найбольш практычныя гаспадары разумелі неабходнасць ліквідацыі прыгонных адносін, якія зжывалі сябе, а астатнія прыстасоўвалі сваю гаспадарку да аджыўшых форм.

М.В. Доўнар-Запольскі паказвае агульны занепад народнай гаспадаркі Беларусі ў XVIII ст. і адмаўляе яе істотныя змены пасля далучэння да Расіі. Аўтар надае значную ролю селяніну ў працэсах развіцця народнай гаспадаркі і заключае, што гаспадарка не можа развівацца станоўча ва ўмовах эксплуатацыі сялян і маральнага падзення феадалаў [1]. Значнае месца ў сваіх даследаваннях навуковец адводзіць гісторыі і структуры гандлю, што можна растлумачыць уплывам тэорыі «гандлёвага капіталу», якая панавала ў той час.

Працы К.І. Кернажыцкага, што датычацца аграрнай гісторыі Беларусі перыяду позняга феадалізму, адрозніваліся ад работ буржуазных гісторыкаў канца XIX – першай паловы XX ст., насілі пераважна апісальны характар. Гісторык даследаваў пытанні структуры і эканамічнага становішча сялянства. Навуковец называе арандатараў канца XVIII ст. капіталістамі і піша аб назапашванні грашовага капіталу дваровымі гаспадаркамі, а другую палову XVIII ст. пазначае як працэс пераходнага перыяду да грашовай гаспадаркі [2]. Высновы вучонага тлумачацца моцнай пазіцыяй у 20–30-я гг. ХХ ст. тэорыі гандлёвага капіталу М.Н. Пакроўскага. Наступныя працы К.І. Кернажыцкага «Брожаскі ключ 1639–1810 гг. (сацыяльна-эканамічны нарыс з гісторыі Бабруйшчыны)» (Мінск, 1929 г.) і «Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яе насельніцтва з XVII да паловы XIX ст.» (Мінск, 1931 г.) таксама напісаны з пазіцый тэорыі гандлёвага капіталу як аднаго з галоўных фактараў капіталізму. У працах гісторык аналізуе становішча сялянства, працэс іх дыферэнцыяцыі на фоне ўзмацнення феадальнага прыгнёту: скарачэнне надзелаў, узмацненне эксплуатацыі. Навуковец піша аб пашырэнні фальварковай гаспадаркі за кошт сялянскіх зямель. Вынікам гэтых працэсаў К.І. Кернажыцкі называе развіццё таварна-грашовых адносін. Аднабаковы аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў даследуемага перыяду, атаясамліванне працэсаў разлажэння феадальна-прыгонніцкіх і зараджэння буржуазных адносін можна растлумачыць павышаным інтарэсам да тэорыі, панаваўшай у той час.

Т.І. Забела [3] аналізаваў становішча сялянства, памеры іх павіннасцей. Гісторык прыйшоў да высновы, што памешчыцкая гаспадарка знаходзілася ў заняпадзе на фоне разнастайнасці і шматлікасці сялянскіх павіннасцей, а гэта найперш сведчыць аб комплекснасці панскага двара. Гісторыкі сярэдзіны 20-х гг. ХХ ст. М.В. Мялешка [4] і А. Шлюбскі [5] аналізавалі стан сельскай гаспадаркі Беларусі. Даследаванні гісторыкаў пераходнага працэсу ад феадальнага спосабу вытворчасці да капіталістычнага насілі неаб'ектыўны характар і знаходзіліся пад уплывам марксісцка-ленінскай метадалогіі. Памылковае сцвярджэнне навукоўцаў пра галоўную прычыну заняпаду феадальнай сістэмы – развіццё прадукцыйных сіл – сведчыла пра неразмежаванне даследчыкамі працэсаў разлажэння феадальна-прыгонніцкіх і зараджэння буржуазных адносін.

Агульнымі для работ па аграрнай гісторыі першага этапу з'яўляюцца такія пытанні, як разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы, развіццё таварна-грашовых адносін, эвалюцыя феадальнай рэнты, дыферэнцыяцыя сялянства, развіццё фальварковай гаспадаркі, першапачатковыя формы назапашвання капіталу і класавыя супярэчнасці. Навукоўцамі былі вызначаны напрамкі для вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі, што абумовіла далейшыя даследаванні.

Рэпазіторый БДПУ

Другі этап (канец 50 – пачатак 80-х гг. XX ст.) характарызуецца канцэнтраваннем прац у залежнасці ад прадмета вывучэння, дыскусійным характарам даследаванняў, што пацвярджаецца выданнем буйных манаграфічных прац. У 50-я гг. XX ст. з'яўляюцца першыя працы па аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.: М.П. Баранава «Развитие промышленности и торговли Белоруссии в начале XIX в.» (1957 г.), В.У. Чапко «Сялянскі рух у першай чвэрці XIX ст.» (1958 г.). Катэгорыі сялян Беларусі ў першай палове XIX ст. сталі прадметам даследавання М.М. Улашчыка. У манаграфіі гісторык вылучае катэгорыі сялян, вызначае іх павіннасці і правы. Даследуючы перадумовы рэформы 1861 г. у Літве і Заходняй Беларусі, аўтар прааналізаваў развіццё форм памешчыцкага прадпрымальніцтва, рост таварнасці гаспадаркі, прывёў прыклады наёмнай працы і маёмаснай дыферэнцыяцыі сялянства [6]. Панаванне паншчыннай сістэмы перашкаджала маёмаснаму расслаенню сялянства, што пацвярджае існаванне натуральнай гаспадаркі ў аграрным сектары Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Гэтыя працэсы сведчаць аб разлажэнні феадальна-прыгонніцкай сістэмы, а не пра генезіс капіталізму, як лічыў М.М. Улашчык. Можна сказаць, што гісторык памылкова атаясамліваў гэтыя два працэсы, як і яшчэ адзін вядомы гісторык таго перыяду – В.У. Чапко, якая пісала, што «важнейшее условие разложения феодально-крепостнической системы было применение наемного труда в помещичьем хозяйстве» [7, с. 4–7]. Вышэйадзначанае з'яўляецца характэрнай рысай зараджэння буржуазных адносін.

Ключавой працай В.У. Чапко з'яўляецца манаграфія «Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в.» (Мінск, 1966 г.). У сваёй рабоце аўтар аналізуе памешчыцкую гаспадарку: землеўладанне, рост таварнасці, прадпрымальніцтва, прамысловасць; сялянскую гаспадарку: катэгорыі сялян, маёмасную дыферэнцыяцыю. В.У. Чапко робіць выснову, што перавага паншчыннай сістэмы, узмацненне эксплуатацыі сялян, заняпад сялянскай гаспадаркі і, як вынік, беднасць памешчыцкага сялянства прывялі да крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы [7, с. 215]. З такім заключэннем можна пагадзіцца, у адрозненне ад памылковай высновы аб тым, што «важнейшее условие разложения феодально-крепостнической системы – применение наемного труда в помещичьем хозяйстве» [7, с. 4–7]. Развіццё прамысловасці і павелічэнне колькасці прамысловых рабочых даследчык таксама называе характэрнай рысай разлажэння феадальна-прыгонніцкай сістэмы (вызначальныя рысы зараджэння буржуазных адносін). Такім чынам, можам зрабіць выснову, што гісторык недастаткова ясна адкрэсліла для сябе гэтыя два працэсы: генезіс капіталізму і разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Аднак крыніцы і шырокі фактычны матэрыял даследаванняў, несумненна, робяць працу карыснай. Наступныя працы В.У. Чапко: «Разложение феодально-крепостнической системы и формирование капиталистических отношений в сельском хозяйстве Белоруссии в первой половине XIX в.» (Мінск, 1968 г.), «Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в.» (Мінск, 1972 г.) выкананы ў тым жа ракурсе, але з акцэнтам на прадмет даследавання: працэс фарміравання капіталістычных адносін у аграрным сектары Беларусі абазначанага перыяду і сялянскі рух (характар, формы і метады).

У адрозненне ад многіх гісторыкаў савецкага перыяду, якія адзначалі панаванне паншчыннай сістэмы ў сельскай гаспадарцы на ўсёй тэрыторыі Беларусі, В.І. Мялешка робіць выснову аб падпарадкаваным становішчы паншчыны ва ўсходняй частцы тэрыторыі Беларусі. У артыкуле «Из истории аграрных отношений в восточной части территории Белоруссии в период упадка Речи Посполитой (с середины XVII в. до 1772 г.)» (Беласток, 1967 г.) аўтар, на падставе архіўнага матэрыялу, аспрэчвае высновы папярэдніх савецкіх гісторыкаў пра адсталасць і заняпад сельскай гаспадаркі ва ўсходняй Беларусі. В.І. Мялешка адзначае, што ў другой палове XVII і ў XVIII ст. на ўсходзе Беларусі існавалі тры тыпы феадальнай рэнты, а ў буйных уладаннях пераважала грашовая [8].

Пытанні гісторыі сялянства і іх сацыяльна-эканамічнага становішча сталі аб'ектам даследаванняў П.Р. Казлоўскага. Гісторык піша пра стан заняпаду ў палітычнай і эканамічнай сферах жыцця Беларусі другой паловы XVII–XVIII ст. і робіць выснову пра паляпшэнне сітуацыі ў канцы XVIII ст., дзякуючы развіццю ўнутранага рынку, пашырэнню попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю і паслабленню ўціску магнатаў. Акрамя таго, навуковец падрабязна характарызуе сацыяльнае і прававое становішча сялян, іх павіннасці і ў выніку канстатуе, што ў канцы XVIII ст. назіралася маёмасная дыферэнцыяцыя сялянства, узрастала адыходніцтва, што ў рэшце рэшт прывяло да «палярызацыі вёскі», зараджэння класа «сялянскай буржуазіі», а гэта, у сваю чаргу, сведчыла пра зараджэнне капіталістычных адносін [9]. П.Р. Казлоўскі прыходзіць да высновы, што ў канцы XVIII ст. адбываўся працэс «сацыяльнага расслаення беларускай вёскі, а ў нетрах феадальнага ладу зараджаліся капіталістычныя адносіны» [9, с. 189].

У.А. Хілюта даследаваў праблему сялянскага землекарыстання і землеўладання

Рэпазіторый БДПУ

ў заходняй частцы тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. Гісторыкам было прааналізавана становішча сялянства: размеркаванне зямлі і працэс абеззямельвання, колькасныя і якасныя змены ў землекарыстанні. Аўтар прыйшоў да высновы аб крызісе феадальна-прыгонніцкай сістэмы, пагаршэнні эканамічнага становішча памешчыцкіх сялян: панаванне паншчыны і ўзмацненне эксплуатацыі сялян [10].

Дыскусійны характар прац, шырокае кола крыніц, уключаных у даследаванні аграрнай праблематыкі, дазволілі вызначыць канчатковы этап савецкай гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.: канец 80 – пачатак 90-х гг. XX ст. У гэты перыяд В.Ф. Голубевым была прааналізавана праблема землеўладання і землекарыстання сялянства Беларусі ў другой палове XVI–XVIII ст. Гісторык вызначыў умовы і характэрныя рысы арганізацыі землеўладання і землекарыстання сялянства ў розных відах феадальнай уласнасці даследуемага перыяду. Навукоўцам была адзначана роля і месца сялянскай абшчыны, выяўлены агульныя і спецыфічныя рысы ў землеўладанні і землекарыстанні сялян заходняга, цэнтральнага і ўсходняга рэгіёнаў Беларусі. У вывадах В.Ф. Голубеў піша пра ўзмацненне рэжыму феадальнай эксплуатацыі і тэндэнцыі да памяншэння памераў сялянскага забеспячэння [11].

В.Э. Загарульская даследавала праблему рэформы дзяржаўнай вёскі Беларусі ў 30–50-я гг. XIX ст. Гісторык пацвярджае меркаванне аб разлажэнні прыгонніцтва, а рэформу дзяржаўнай вёскі называе наступствам новых эканамічных умоў развіцця Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст.: насяванне буржуазных адносін. Што датычыцца Беларусі, то даследчык робіць выснову аб тым, што тут «по своему социально-экономическому содержанию, результатам реформа была более глубокой, чем в Центральной России» [12, с. 16]. В.Э. Загарульская тлумачыць гэта тым, што аграрнае развіццё ў Беларусі суправаджаліся глыбокімі зменамі ў галіне сялянскага землекарыстання і рэнтных адносін. Выяўленню асаблівасцей, узроўню і накіраванасці развіцця зямельных адносін усходняй часткі тэрыторыі Беларусі прысвечана дысертацыя Я.К. Анішчанкі «Земельные отношения в восточной Белоруссии во второй половине XVIII – начале XIX в.» (Мінск, 1989 г.). Даследчык прыходзіць да высновы аб тым, што ўключэнне ўсходняй часткі тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі не паўплывала на ўзровень землезабеспячэння сялян. Сялянства ўсіх відаў феадальнага землеўладання было надзелена ворыўнай зямлёй на ўзроўні пражытачнага мінімуму. Найбольш забяспечанымі гісторык называе сялян дробнай шляхты. Аброчныя плацяжы перакладаліся на больш заможныя пласты сялянства, неплацежаздольныя ж пераводзіліся на паншчыну – гэтыя дзве формы феадальнай рэнты і былі пануючымі ў даследуемы перыяд [13, с. 19].

У працы І.А. Груцо «Крестьянское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в.» быў пастаўлены шырокі спектр задач: вызначэнне ўплыву сацыяльна-эканамічных, палітычных працэсаў, якія адбываліся ў Беларусі ў апошняй чвэрці XVIII – першай палове XIX ст., на развіццё сялянскай гаспадаркі; выяўленне асаблівасцей сялянскага землеўладання і землекарыстання ў перыяд разлажэння феадальных і зараджэння буржуазных адносін; аналіз развіцця сялянскай гаспадаркі па рэгіёнах [14, с. 7]. У выніку даследаванняў І.А. Груцо прыйшоў да высновы аб крызісе прыгоннай сістэмы і генезісе капіталізму ў Беларусі ў першай палове XIX ст. Навуковец адзначаў паступовае скарачэнне ў сялянскіх надзелах спрыяльнай для ворыва зямлі. Гісторыкам была вызначына спецыялізацыя гаспадарак па рэгіёнах і паглыбленне сувязі сялянскай гаспадаркі Беларусі з унутраным рынкам, а таксама ўцягванне яе ў таварна-грашовыя адносіны і, як вынік, сацыяльнае расслаенне, асабліва сярод дзяржаўных сялян [14, с. 20].

Усе працы апошняга, трэцяга, этапу савецкай гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі даследуемага перыяду, прааналізаваныя намі, метадалагічна абапіраюцца на марксісцка-ленінскую тэорыю аб грамадска-эканамічных фармацыях, што цалкам лагічна для таго часу. Нягледзячы на прыхільнасць да згаданай метадалогіі, працы адрозніваюцца ад даследаванняў папярэдняга адрэзку часу шматаспектнасцю, больш глыбокім фактычным матэрыялам і ўвядзеннем у навуковы ўжытак новых архіўных матэрыялаў.

Такім чынам, у савецкі перыяд былі праведзены шырокія і грунтоўныя даследаванні па праблеме аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. Мы вылучылі тры хвалі найбольш актыўнага вывучэння тэмы і ўвядзення новага кола крыніц, прааналізавалі разнастайныя пункты погляду і вызначылі напрамкі даследаванняў гісторыкаў па аграрнай праблематыцы. З пачатку 90-х гг. тэарэтычны плюралізм дазволіў спецыялістам вывучаць гістарычны працэс з пункту гледжання розных метадалагічных падыходаў, таму даследаванні ў галіне аграрнай гісторыі Беларусі знайшлі свой лагічны працяг.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Довнар-Запольский, М.В.* История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. – 3-е изд. испр. и доп. – Минск: Беларусь, 2011. – 591 с.
2. *Кернажыцкі, К.І.* Гаспадарка староствaў на Беларусі і эканамічны стан іх насельніцтва ў другой палавіне XVIII ст. / К.І. Кернажыцкі. – Мінск, 1928. – 198 с.


Репозиторий БГПУ

3. *Забела, Т.І.* Панская гаспадарка на Беларусі ў другой палове XVIII веку і быт падданага сялянства / Т.І. Забела. – Мінск: Ін-т беларус. культуры, 1928. – 152 с.
4. *Мелешко, М.В.* Паншчына на Беларусі (Гісторыка-этнаграфічны нарыс з жыцця сялян міншчыны за прыгонам 1826–1857 гг.) / М.В. Мелешко // Полымя. – 1926. – № 4. – С. 106–129.
5. *Шлюбскі, А.* Паны і сяляне ў першай палове XIX ст. / А. Шлюбскі. – Мінск, 1924.
6. *Улащик, Н.Н.* Сельское хозяйство Литвы и Западной Белоруссии в первой половине XIX в.: (предпосылки крестьянской реформы 1861 года): автореф. дис. … д-ра ист. наук / Н.Н. Улащик. – М., 1963. – 37 с.
7. *Чепко, В.В.* Сельское хозяйство в Белоруссии в первой половине XIX в. / В.В. Чепко. – Минск: Наука и техника, 1966. – 219 с.
8. *Мелешко, В.И.* Хозяйство крупных феодалов Восточной Белоруссии во второй половине XVII и в XVIII в. (до воссоединения с Россией): автореф. дис. … канд. ист. наук / В.И. Мелешко. – Минск, 1972. – 35 с.
9. *Козловский, П.Г.* Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в.: По материалам магнатских вотчин / П.Г. Козловский; под ред. Н.Н. Улащика. – Минск,1969. – 203 с.
10. *Хилюта, В.А.* Землепользование и землевладение бывших помещичьих крестьян Гродненской губернии в середине XIX века (40-е – начало 70-х гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В.А. Хилюта. – Минск, 1982. – 22 с.
11. *Голубев, В.Ф.* Землевладение и землепользование крестьян Белоруссии во второй половине XVI–XVIII вв.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В.Ф. Голубев. – Минск: АН БССР, Ин-т истории, 1987. – 20 с.
12. *Загорульская, О.Э.* Реформа государственной деревни Белоруссии: (30–50-х гг. XIX в.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / О.Э. Загорульская. – Минск, 1987. – 17 с.
13. *Анищенко, Е.К.* Земельные отношения в восточной Белоруссии во второй половине XVIII – начале XIX вв.: автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Е.К. Анищенко. – Минск: АН БССР, Ин-т истории, 1989. – 21 с.
14. *Груцо, И.А.* Крестьянское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в.: автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / И.А. Груцо. – Минск: Мин. гос. пед. ин-т им. А.М. Горького, 1989. – 20 с.

*Summary*

*The Belorussian Soviet historiography of agrarian history of the end of the 18th – the first half of the 19th century is considered in the article. The literature on an indicated issue (from the 20-ies up to the the end of the 80-ies of the 20th century) is analyzed and the periodization of the Soviet historiography of agrarian issues is given. The basic trends and approaches of agricultural research of a certain period of the history of Belarus are outlined. It is concluded that the extensive and thorough research on an indicated issue were conducted during the Soviet period, which became the basis for further analysis of the agrarian history of Belarus of the end of 18th – the first half of the 19th century in the modern period from the point of view of different methodological approaches.*

Паступіў у рэдакцыю 11.10.2013 г.

Репозиторий БГПУ

*УДК 930(47)«18»*

***У.М. Завальнюк,***
*кандыдат гістарычных навук, ксёндз-магістр, настаяцель*
*Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ ПОСТУ Ў РАСІЙСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

Другая палова XIX ст. вызначаецца шматлікімі ўзрушэннямі, а таксама рэформамі, якія адбываліся па ўсіх кірунках развіцця грамадства: палітычным, эканамічным, сацыяльным і духоўна-культурным. Варта адзначыць, што на працягу пэўнага часу прадметам гістарычнай навукі з'яўлялася вывучэнне палітычнай гісторыі (гісторыі імперый, дынастый і г. д.). Толькі ў эпоху крушэння феадалізму і станаўлення капіталізму прадмет даследавання быў значна пашыраны. У яго сферу былі ўключаны пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця, культурныя і духоўныя праблемы народаў, якія насялялі тэрыторыю Расійскай імперыі.

Прадмет даследавання расійскай гістарыяграфіі ў XIX ст. вызначаўся даволі вузкімі рамкамі пазнання. Толькі з сярэдзіны стагоддзя нароўні з палітычнай гісторыяй стала вывучацца сфера сацыяльна-эканамічных з'яў, якія разглядаліся з боку іх знешніх форм (гаспадарка натуральная, таварна-грашовая і г. д.), а ход сацыяльнага развіцця трактаваўся як буржуазны рэфармізм. Даследаванні ў галіне гісторыі хрысціянства і Рускай Царквы як асаблівай дысцыпліны таксама цалкам належаць XIX ст. Навуковая дзейнасць гісторыкаў па вышэйпазначанай праблематыцы актывізавалася ў 60-х гг. XIX ст.

У 1861 г. у Расійскай імперыі было адменена прыгоннае права. Рэформы ў судзе, адукацыі, друку і ваеннай справе атрымалі назву «Вялікіх рэформаў». Вынікам укаранення іх у жыццё стала якаснае змяненне сацыяльна-палітычных адносін, тэмп росту эканомікі, узнікненне новых сацыяльных структур. Праваслаўная Царква таксама была вымушана ўбудоўвацца ў сацыяльныя пераўтварэнні, якія ініцыіраваліся ўрадам, і рабіць пэўныя захады ў правядзенні рэфармавання ў духоўнай сферы.

Знакавай вяхой у гісторыі Царквы ў цэлым і царкоўна-гістарычнай навуцы ў прыватнасці стала апублікаванне ў 1867 г. новых статутаў духоўных вучылішч, семінарый, а ў 1869 г. статута духоўных акадэмій.